***Т. І. Васюк,*** *дацэнт,*
*дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# Г. І. БАРЫШАЎ – ДАСЛЕДЧЫК І КАНСУЛЬТАНТ ПА ПЫТАННЯХ БЕЛАРУСКАЙ І СУСВЕТНАЙ МАСТАЦКАЙ КУЛЬТУРЫ

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

Гурый Іларыёнавіч Барышаў (1928–2001) – вядомы беларускі вучоны і педагог, які ўнёс вялікі ўклад у фарміраванне і развіццё беларускага мастацтвазнаўства і мастацкай адукацыі.

Гурый Іларыёнавіч Барышаў нарадзіўся 30 красавіка 1928 г. у Ташкенце. З 1946 г. па 1950 г. навучаўся ў Ташкенцкім дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва імя А. М. Астроўскага. Пасля заканчэння інстытута быў накіраваны па размеркаванні ў Мінск, у Дзяржаўны рускі драматычны тэатр імя М. Горкага. У 1952 г. Гурый Іларыёнавіч паступіў у аспірантуру пры Інстытуце літаратуры і мастацтва АН БССР (спецыялізацыя «тэатральна-дэкаратыўнае мастацтва»). Пасля абароны кандыдацкай дысертацыі «Тэатральна-дэкаратыўнае мастацтва Беларусі 1917–1941 гг.» у 1961 г. Гурый Іларыёнавіч стаў загадчыкам кафедры гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута [1, с. 466].

З 1976 г. і да апошніх дзён жыцця прафесійная дзейнасць Гурыя Іларыёнавіча была цесна звязана з навуковымі даследаваннямі ў галіне мастацтвазнаўства, тэатразнаўства, музыказнаўства, з гісторыяй мастацка-матэрыяльнай культуры і выкладаннем у Беларускім універсітэце культуры (зараз Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў) на кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры, якую ён узначальваў з 1983 г. па 1994 г. У 1989 г. ім была паспяхова абаронена доктарская дысертацыя па тэме «Тэатральная культура Беларусі XVIII стагоддзя» [1, с. 466].

Трэба адзначыць, што ўнёсак Гурыя Іларыёнавіча Барышава ў беларускую навуку немагчыма ацаніць. Навуковец міжнарод-

нага ўзроўню Барышаў усімі магчымымі шляхамі папулярызаваў тыя веды, якія ён атрымліваў праз навуковыя даследаванні. Прафесар Г. І. Барышаў быў выдатным лектарам, а яго лекцыі былі сапраўднымі імправізаванымі спектаклямі. Гісторыя выяўленчага мастацтва і матэрыяльна-мастацкай культуры раскрывалася ім у кантэксце станаўлення і развіцця мастацкіх эпох, жыцця і творчасці майстроў, якія іх праслаўвілі [1, с. 472].

Разгледзім, як Г. І. Барышаў дзяліўся сваімі ведамі па гісторыі айчыннай і сусветнай мастацкай культуры з маладым пакаленнем на прыкладзе творчай сустрэчы прафесара Г. І. Барышава са студэнтамі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (зараз Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў), якая адбылася ў 1976 г. Знаток сусветнай і айчыннай міфалогіі Гурый Іларыёнавіч паспяхова правёў майстар-клас для студэнтаў дэкаратыўна-прыкладнога аддзялення, будучых мастакоў-керамістаў, падчас якога з захапленнем распавядаў аб існаванні іншых сусветаў і іншых мiроў, расказваў пра пантэон славянскіх багоў і г. д. Падчас сустрэчы са студэнтамі прафесар Г. І. Барышаў апісваў падрабязна ў дэталях вобразы міфалагічных істот, якія атаясамліваюцца з сіламі прыроды і старажытнага календара, што надало маладым мастакам натхнення і імкнення да творчасці. Пасля, па жаданні, студэнты маглі атрымліваць ад яго дадатковыя кансультацыі па цікавячых пытаннях. Такім чынам, Гурый Іларыёнавіч дапамог творчай студэнцкай моладзі абраць напрамак па раскрыцці мастацкіх вобразаў у творчых працах і дыпломных праектах на міфалагічную тэматыку.

Студэнты тэатральна-мастацкага інстытута (зараз вядомыя мастакі) пасля сустрэч з Г. І. Барышавым для сваіх творчых прац сталі выкарыстоўваць вобразы славянскай міфалогіі. Напрыклад, Зіменка Аляксандр стварыў у той час партрэтныя і фігуратыўныя выявы Перуна, Жыжаля і іншых багоў; Васюк Тамара – пластычны вобраз Зюзі, выкарыстаўшы спосаб абагульнення ў вобразным вырашэнні дэкаратыўнай скульптуры, які выкананы ў шамоце. «Гарэзлівы, смяшлівы Зюзя – добры стары чалавек, які мае халодны каларыт у знешнасці. Ён здольны замарозіць неслухмяных людзей, якія не апрануты ўзімку ў кажушок і валёнкі, а басанож гуляюць па снезе» – так казаў Г. І. Барышаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Трэба адзначыць, што многія студэнты ляпілі ў гліне і стваралі ў метале скульптурныя вобразы славянскіх багоў Жыжы і Зюзі. Такім вобразам, дзіўным чынам словы Гурыя Іларыёнавіча пераўтвараліся ў форму і пластыку міфалагічных выяў: постацей багоў агню і холаду – Жыжаля і Зюзі. Адзначым, што ў тыя далёкія сямідзясятыя і васьмідзясятыя гады XX ст. кераміка набывае якасці станковага мастацтва. Яна выкарыстоўвае разнастайныя метады і прыёмы творчасці.

У наш час бог агню Жыжаль з славянскай міфалогіі рушыў у сімволіку «Арт-Жыжаля» – міжнароднага пленэру па кераміцы, які стварыў вядомы мастак-кераміст Калтыгін Валерый Аркадзьевіч.

Дарэчы, Жыжаля Г. І. Барышаў параўноўваў з Зеўсам: «Магутны Бог, аголены да пояса, са стрэлкамі-маланкамі ў руцэ, гарэзлівы і кучаравы».

Багатая славянская міфалогія мела свой пантэон багоў, але сёння няма сувязі паміж міфалагічнымі істотамі і сучаснымі людзьмі. Аднак значэнне і ўвасабленне многіх багоў па-ранейшаму мае знакавы змест. Напрыклад, Сварог увасабляе сабой неба, дзе знаходзіцца мноства іншых багоў. Дажбог – шчодры бог шчасця і лета. Пярун – бог вайны і велічы. Ярыла – бог сонца і святла. Бог Род асабліва паважаўся і шанаваўся славянамі ва ўсе часы. Бог Чур меў увасабленне абярэга з мноствам характарыстык і значэнняў. Купала – бог лета, які меў прыгажосць і адданасць маці-зямлі. Лель – гэта ўвасабленне маладосці і прыгажосці ў форме музычнай творчасці. Пярун – громавержац, знаходзіўся ўверсе, на горцы, а Велес – унізе, аберагаючы скот. У славянскай міфалогіі існуюць і жаночыя вобразы: Лада – гэта багіня кахання, прыгажосці, маладосці. Макош – багіня жаноцкасці, яна жонка Перуна, якая не заўсёды мае лагодны характар.

Паганскае ўяўленне аб пантэоне багоў захавалася, нягледзячы на з’яўленне хрысціянства на славянскіх землях. Гэты пласт культуры разумеў і шанаваў Гурый Іларыёнавіч Барышаў. Прафесар ведаў пра цікавыя сувязі адзінства прыродных з’яў. Жыватворныя сілы прыроды надаюць моц адвечным вобразам славянскіх багоў у выглядзе сонца, дажджу, ветру і іншых прыродных з’яў.

Трэба адзначыць, што студэнтаў Г. І. Барышаў ніколі не запрашаў рабіць рэканструкцыю міфалагічных герояў славян і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праславян, ён запрашаў іх да творчасці ў напрамку адлюстравання гістарычнага, міфалагічнага і казачнага эпасу славян.

Трэба дадаць, што Гурый Іларыёнавіч Барышаў быў знаўцам у многіх галінах мастацтва. З павагай ён адносіўся да мастацкай керамікі, дзе архаіка і сучаснасць аб'яднаны ў адно цэлае. Асаблівую ўвагу Гурый Іларыёнавіч надаваў такім старажытным тэхнікам дэкарыравання керамікі, як глянцаванне і абвара. Жывапісец Алесь Цыркуноў у партрэце Г. І. Барышава зафіксаваў з натуры момант, калі прафесар любуецца формай глянцаванага маленькага глячка, выкананага з прыроднай чырвонай гліны.

Спадчына Гурыя Іларыёнавіча Барышава пакладзена ў аснову навуковай і педагагічнай дзейнасці яго вучняў і паслядоўнікаў, а яго навуковыя працы не губляюць актуальнасці і сёння.

Дарэчы, ужо будучы выкладчыкам кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў аўтар артыкула, абапіраючыся на веды, атрыманыя ў студэнцтве ад Г. І. Барышава, зацікавіла і сваіх студэнтаў міфалагічнай тэмай. Добрым прыкладам таму сталі творчыя працы ў керамічным матэрыяле яе выхаванцаў – лаўрэатаў шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных творчых конкурсаў і фестываляў: скульптурныя дэкаратыўныя кампазіцыі «Духі» Алены Зіневіч, «Хатнікі» Андрэя Княжэвіча і інш. З гэтага можна зрабіць выснову, што справа прафесара Г. І. Барышава няспынна працягвае сваё існаванне ў навуковай і творчай дзейнасці наступных пакаленняў.

---

1. *Пискун, Н. Д.* Гурий Илларионович Барышев – просветитель, ученый-энциклопедист (к 90-летию со дня рождения) / Н. Д. Пискун // Культура. Наука. Творчество : XII Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 3 мая 2018 г. : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; редкол.: А. А. Корбут [и др.]. – Минск, 2018. – С. 465–473.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ